

■ На слыху

# РАЗГУЛ СТЫХІІ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

**Спіс наступстваў непагадзі, што ўсталявалася ў Беларусі на гэтым тыдні, працягвае папаўняцца. Пасля таго, як па паўночным захадзе краіны прайшлі навальніцы са смерчамі, надышла чарга іншых рэгіёнаў і сталіцы. Паваленыя дрэвы, дзясяткі пашкоджаных аўтамабіляў, затапленні на шматлікіх вуліцах — з усім гэтым сутыкнуўся Мінск 13 ліпеня.**

Пакуль супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях працягвалі працаваць у Шаркаўшчынскім раёне, дзе ў панядзелак прайшла магутная бура (па рашэнні ўрада ў гэты рэгіён ужо накіраваны дадатковыя сродкі з дзяржаўнага матэрыяльнага рэзерву), непагадзь бушавала ў іншых месцах. Па інфармацыі МНС, у аўторак ад стыхіі пацярпелі 15 населеных пунктаў у 11 раёнах Брэсцкай, Гомельскай, Мінскай і Магілёўскай абласцей. Пашкоджаны дахі 78 жылых дамоў, 3 аб'екты сацкультбыту, 1 вытворчае і 38 сельскагаспадарчых збудаванняў. На шчасце, ад стыхіі ніхто не пацярпеў. Аварыйныя брыгады праводзяць аднаўленчыя работы.

Калі эпіцэнтрам катаклізму ў панядзелак стала Шаркаўшчына, то ў аўторак найбольш пацярпеў Дзяржынск. Так, на чыгуначным перагоне Негарэлае — Койданава — Фаніпаль вецер паваліў на рэйкі дрэвы. Цягнікам давялося рухацца ў абодвух кірунках па адным пуці, затрымка ў руху склала ад 8 да 55 хвілін. Увечары нармальны рух быў адноўлены. Яшчэ адно дрэва, на гэты раз у самім горадзе, упала на газапровад высокага ціску. Без забеспячэння палівам застаўся мясцовы завод лакафарбавых вырабаў, але вытворчасць не спынілася. Са 111 зафіксаваных па краіне выпадкаў падзення дрэў 95 адбылося менавіта на Дзяржыншчыне.

Не нашмат лепшай была сітуацыя і ў іншых рэгіёнах. У аварыйным парадку адключылася падстанцыя «Хойнікі-1», пакінуўшы без электраэнергіі сем населеных пунктаў і сам райцэнтр. Як паведамляе «Белэнерга», агульная колькасць абясточаных населеных пунктаў у аўторак зноў узрасла да амаль трох сотняў. Раніцай серады без электраэнергіі заставалася 10 населеных пунктаў, 1 сельскагаспадарчы будынак і 34 трансфарматарныя падстанцыі на Магілёўшчыне і Міншчыне.



У сераду ж са стыхіяй сутыкнуліся жыхары сталіцы. Магутная бура і залева на некаторы час літаральна паралізавалі жыццё горада. Бачнасць на дарогах падчас навальніцы знізілася амаль да нуля. Асобныя раёны традыцыйна сутыкнуліся з падтапленнямі. Вуліцы Няміга, Гурскага, Лабанка, Калінотўскага, Кірава, Фрунзэ, праспект Ракасоўскага і многія іншыя апынуліся пад вадой. Усяго было зафіксавана каля 50 затопленых месцаў. Па інфармацыі **прэс-сакратара Мінскага гарадскога ўпраўлення МНС Віталя ДЭМБОЎСКАГА,** у горадзе быў уведзены план «Пасейдон», а на месцы падтапленняў была напраўлена тэхніка міністэрства і прадпрыемства «Гаррэмаўтадар».

Па стане на 16 гадзін 13 ліпеня ў сталіцы было павалена не менш за 100 дрэў, пашкоджаны шматлікія аўтамабілі, у некаторых дамах выбіты шыбы. Усяго ў горадзе працавала 30 машын МНС, 140 ратаўнікоў. Як мінімум адзін пацярпелы быў шпіталізаваны.

Аранжавы ўзровень небяспекі захаваецца па ўсёй тэрыторыі краіны і сёння. Удзень сіноптыкі прагназуюць пераменную воблачнасць, а ўночы — дажджы і навальніцы, у асобных раёнах град. На захадзе краіны чакаюцца моцныя залевы.

Непрыемнае здарэнне адбылося ў Нацыянальным аэрапорце «Мінск». Былі затрыманы прылёт рэйсаў з Масквы і Амстэрдама. Самалёты авіякампаніі «Белавія», што ляцелі з Тэль-Авіва і Ларнакі, сышлі на запасны аэрапорт у Гомель. Акрамя гэтага, два судны сутыкнуліся на тэрыторыі аэрапорта, адно з іх належыць беларускаму перавозчыку. Як паведамляюць у «Белавія», у выніку інцыдэнту ахвяр і параненых няма. На сайце аэрапорта гаворыцца, што ён працуе ў штатным рэжыме, а ў выніку непагадзі ніхто з супрацоўнікаў, пасажыраў і наведнікаў не пацярпеў. Разам з тым павалены дрэвы і асобныя рэкламныя канструкцыі. У будынку аэравакзала выбіта некалькі вокнаў і дэфармавана пакрыццё столі каля іх. Праводзіцца ліквідацыя выяўленых пашкоджанняў.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

■

# Славянскі. 25-ты. Юбілейны

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

12 ліпеня ў гонар юбілею фестывалю можна было набыць квіткі на канцэрты, спектаклі і іншыя мерапрыемствы са зніжкай 25%.

Учора (13 ліпеня) у Летнім амфітэатры адбыўся сольны канцэрт Крысціны Арбакайтэ (квіткі каштавалі ад 20 да 45 рублёў). А позна вечарам — бенефіс Максіма Галкіна. У якасці спецыяльнай госці ён запрасіў Алу Пугачову. Задавальненне ўбачыць на сцэне Максіма Галкіна каштавала ад 45 да 95 рублёў...

Афіцыйны старт фэсту распачнецца ў 20.30. У Летнім амфітэатры выступяць згаданыя вышэй артысты, а таксама Надзея Бабкіна і тэатр «Руская песня», Мікалай Цыскарыдзе, Томас Андэрс (Германія), Майкл Болтан (ЗША), Уладзімір Гасцюхін, Анатоль Ярмоленка і ансамбль «Сябры», Алена Ланская, Пётр Ялфімаў, Руслан Аляхно... Сярод замежных удзельнікаў ёсць госць нават... з Мексікі. Заўтра (15 ліпеня) у амфітэатры гала-канцэрт «зорак» беларускай і расійскай эстрады «Віцебск збірае сяброў». Ён прысвечаны юбілею «базару». Выступяць уладальнікі фестывальных гран-пры дарослага і дзіцячых конкурсаў розных гадоў.

Вельмі шмат вядомых артыстаў парадуюць сваім майстэрствам і на канцэрце «Саюзная дзяржава запрашае...» Ён — частка культурнага праекта фестывалю, прысвечанага саюзу Расіі і Беларусі.

У канцэртнай зале «Віцебск» адбудзецца паўфінал XXV Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні. Маладыя спевакі выканаюць нацыянальныя хіты сваіх краін.



На выставе работ Юдэля ПЭНА.

Фота БЕЛТА.

## ВІЗІТОЎКА ПУЦІНА І РОВАР... СВЯТАРА

Сёлета на «базары» шмат унікальных і цікавых выставак. Упершыню ў Беларусі ў Віцебскім мастацкім музеі прадстаўлены два творы Шагала: «Чорныя палюбоўнікі» і «Купанне дзіцяці». Іх прывезлі з Пскоўскага дзяржаўнага аб'яднанага гісторыка-архітэктурнага і мастацкага музея-запаведніка. Каля сямі гадоў вяліся адпаведныя перагаворы. Карціны можна будзе ўбачыць да сярэдзіны жніўня. Там жа прадстаўлены работы Юдэля Пэна — настаўніка Шагала. Прыемным сюрпрызам на фестывалі стала выстава Івана Хруцкага (з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі).

У будынку ратушы — сімвале Віцебска — музейшчыкі здзіўляюць выстаўкай «З любоўю да Беларусі», на якой прадстаўлены падарункі ад кіраўнікоў дзяржаў і іншых афіцыйных асоб Прэзідэнту нашай краіны. Ёсць там і ўзнагароды А. Лукашэнкі за заснаванне ЕАЭС і Мытнага саюза. Уладзімір Пуцін падарыў чайны сервіз «Маскоўскі Крэмль» Імператарскага фарфоравага завода, набор памятных медалёў у гонар 200-годдзя Айчыннай вайны 1812 г. і не толькі. Побач візітоўка Пуціна, на якой няма нумароў тэлефонаў.

Геаграфія краін, чые прадстаўнікі ўручалі падарункі, вельмі шырокая: Азербайджан, В'етнам, Індыя, Інданезія, Кітай, Карэя, Пакістан, ЗША... Усе экспанаты з фондаў Музея сучаснай беларускай дзяржаўнасці — філіяла Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь.



На канцэрце Сяргея ЛАЗАРАВА.

Варта ў гэтыя дні наведаць і выстаўку з Італіі «Усё жыццё ў адным ровары». Яе экспанаты пераконваюць, што ў Італіі веласіпеды ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзя былі не толькі транспартным сродкам, але і перасоўнымі міні-вытворчасцямі. Калекцыянер шукаў і збіраў рарытэтныя ровары па ўсёй Італіі каля 40 гадоў! Яго калекцыя налічвае больш за 70 экспанатаў. Самаму «маладому» — 60 гадоў! Наведвальнікі ўбачаць ровар — лялечны тэатр, ровар — кінатэатр, ровар — газетны кіёск, складаны веласіпед салдата-стралка. Сярод іншых і колы слесара, каваля, краўца, пекара, малочніка, шаўца, цырульніка, камінара, лекара, святара. Ёсць і пацешны веласіпед блазна... Выстава выклікае захапленне ва ўсіх, незалежна ад узросту. Але асабліва яна падабаецца дзецям! Беларусь — першая краіна, куды вывезлі веласэкспазіцыю з Італіі. Яна пабывала ўжо ў Мінску, Гомелі. І цяпер у Віцебску.

## І КАНДУКТАР ЛЯ СТАРЫХ ТРАМВАЯЎ

Недалёка ад амфітэатра (каля дырэкцыі трамвайна-тралейбуснага ўпраўлення) учора рыхтаваліся прэзентаваць скульптуру кандуктара. Яна ўстаноўлена побач з адноўленымі раней рарытэтнымі трамвайнымі вагонамі. Вядома, што менавіта Віцебск стаў першым на тэрыторыі сучаснай Беларусі горадам, дзе з'явіўся электрычны транспарт. Захаваўся да нашых дзён будынак, дзе было абсталяванне для выпрацоўкі электраэнергіі. Ён стаіць літаральна насупраць амфітэатра.

Недалёка ад плошчы Перамогі днямі з'явілася стылёвая паштовая скрынка. Сёння РУП «Белпошта» запускае ў абарачэнне спецыяльны паштовы штэмпель. На ім — выява галоўнай сцэнічнай пляцоўкі «базару»... У выніку з Віцебска можна адпраўляць лісты з фестывальным штэмпелем.

Упершыню на фэсце працуе спецыялізаваная пляцоўка «Краіна дзяцінства». Там можна ўбачыць выступы дзіцячых калектываў, навучыцца ў рамеснікаў рабіць сувеніры, весела прабавіць час на атракцыёнах. Спецыялізаваны кірмаш карыстаецца вялікай папулярнасцю.

Шмат цікавага можна ўбачыць у «Горадзе майстроў», на віцебскім «арбаце». Пра гэта «Звязда» раскажа больш падрабязна ў наступных нумарах.

Горад у гэтыя дні жыве па адмысловым фестывальным раскладзе. У прыватнасці, ноччу працуе грамадскі транспарт. Дарэчы, падчас фэстывалю рух па дарогах рэгулююць і... жанчыны.

Амаль што кругласутачна ў горадзе на вуліцах адбываецца нешта «базарнае»: спяваюць і танцуюць, працуюць гандлёвыя падворкі. Сумна тут не бывае. І заўсёды ёсць мерапрыемствы на любы густ.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*